асабліва вялікай грузападымальнасці, а таксама іншага цяжкага транспартнага абсталявання для горназдабыўной і будаўнічай галін прамысловасці [5].

**Заключэнне.** Такім чынам, абрэвіятуры, або складанаскарочаныя словы, з’яўляюцца эфектыўным сродкам моўнай эканоміі. У сучаснай беларускай мове абрэвіятуры актыўна функцыянуюць як назвы арганізацый, устаноў (банкаў, прадпрыемстваў, кампаній і г.д.), аб’яднанняў і саюзаў, палітычных партый і рухаў, ідэалагічных плыняў.

Прыведзеныя вышэй абрэвіятуры з’яўляюцца агульнамоўнымі. Усе прааналізаваныя складана-скарочаныя словы ўтвораны ад прыметніка *беларускі.* Для найменняў, што валодаюць лінгвакраіназнаўчай семантыкай, абрэвіяцыя з’яўляецца малапрадуктыўным спосабам утварэння.


1. Пятрова, Н.П. Да праблемы лінгвакраіназнаўчага апісання нацыянальна-культурнай семантыкі фразеалагічных адзінінак беларускай мовы [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://libr.msu.by/bitstream/123456789/3991/1/2900m.pdf. Дата доступу: 04.09.2019.
2. Марозава, Я.Н. Словаўтварэнне. Тэарэтычныя асновы, узоры разбору, тэсты, кантрольная работа : вучэбна-метад. комплекс па сучаснай беларус. мове / Я.Н. Марозава ; М-ва адукацыі РБ, УА "ВДУ імя П. М. Машэрава". – Віцебск : Выд-ва УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2005. – 45 с.
3. Афіцыйны сайт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://nasb.gov.by/bel . – Дата доступу: 02.09.2019.
4. Афіцыйны сайт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://time.bsu.by/ru. – Дата доступу: 02.09.2019.
5. Афіцыйны сайт Беларускага аўтамабільнага завода [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.belaz.by. – Дата доступу: 02.09.2019.


## НАЦЫЯНАЛЬНА-ПРЭЦЭДЭНТНЫЯ ІМЁНЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ


***Чарняўская Г.А.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Мартынкевіч С.В., канд. пед. навук, дацэнт*


Ужыванне прэцэдэнтных імёнаў у мастацкім тэксце вядзе за сабой адсылку да пэўнай значнай з’явы, асобы, падзеі ці гістарычнага перыяду. Выяўленне і даследаванне прэцэдэнтных феноменаў ў сучаснай беларускай паэзіі актуальнае з той прычыны, што гэта дае магчымасць найбольш поўна раскрыць з’яву прэцэдэнтнасці ў дачыненні да выяўлення асаблівасцей моўнай карціны свету беларусаў і іх менталітэту.

Мэта працы – выявіць семантычныя, вобразна-выяўленчыя і функцыянальныя асаблівасці нацыянальных прэцэдэнтных імёнаў у сучаснай беларускай паэзіі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі вершаваныя творы Генадзя Бураўкіна. Метады даследавання – апісальны, параўнальны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Прэцэдэнтныя імёны ўяўляюць сабой мікратэкст, які нясе важную ў культурным плане інфармацыю, што застаецца невербалізаванай. Выкарыстанне прэцэдэнтных імёнаў – зручны спосаб перадаць аб’ёмную і даволі складаную ў зместавым і эмацыйным плане звесткі ў сціслым, эканомным выглядзе.

Прэцэдэнтнае ўласнае імя – гэта імя, звязанае ці з прэцэдэнтным тэкстам або з прэцэдэнтнай сітуацыяй. Гэта свайго роду складаны моўны знак, пры ўжыванні якога ў камунікацыі ажыццяўляецца апеляцыя да набору дыферэнцыяльных прыкмет дадзенага імя. У беларускай мове функцыянуюць як універсальныя, так і нацыянальна-спецыфічныя прэцэдэнтныя феномены, якія змяшчаюць ў сабе этнакультурны кантэкст.

Прэцэдэнтныя імёны знайшлі сваё месца і ў паэтычнай творчасці. Яны дапамагаюць аўтару скласці яскравы вобраз лірычнага героя, дакладна апісаць падзеі, перадаць складанае ў простым. Верш – з’ява сама па сабе шматгранная, дзе ў сціслым выглядзе перадаюцца пачуцці, уяўленні, вобразы. У сваіх творах Генадзь Бураўкін шырока выкарыстоўвае прэцэдэнтныя імёны розных тыпаў. Аўтар актыўна карыстаецца ўласцівасцямі імёнаў, якія абумоўлены асаблівасцямі іх лінгвістычнай прыроды, каб выклікаць шэраг звязанных з імі асацыяцый і ўяўленняў.

Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч – гэта сімвалы беларускай літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзяў, самасвядомасці і адданасці роднаму краю і свайму народу. Іх гады жыцця і творчасці прыпалі на час станаўлення беларускай нацыі, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Іх творчасць з’яўляецца своеасаблівым летапісам жыцця беларускага народа, у ёй адбіўся нацыянальны характар, нацыянальнае светаразумменне і паэтычнае светаўспрыманне ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Класікі беларускай літа-

ратуры ўнеслі значны ўклад і ў фарміраванне новай беларускай літаратурнай мовы. Таму ў вершах сучасных беларускіх паэтаў асобнае месца займаюць прэцэдэнтныя феномены ***Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч.***

Прэцэдэнтнае імя ***Янка Купала*** ўтрымлівае ў сабе шэраг асацыяцый: *свята "Купалле", "Жалейка", XX стагоддзе, класіка, тэатр імя Янкі Купалы, "Паўлінка".*

У вершах Генадзя Бураўкіна вобраз Янкі Купалы з'яўляецца сімвалам моцы, індывідуальнасці і самабытнасці беларусаў. Генадзь Бураўкін кажа пра творы Янкі Купалы як пра велічную і неўміручую з'яву ў жыцці кожнага беларуса:

*Каб ні крупінкі сонца не прапала*
*З крывёю заваёваных сцягоў,*
*Каб кожны дзень да вас ішоў* ***Купала***
*Народнай незараслаю сцягой…*

У вершаваных радках вобраз Янкі Купалы выступае сімвалам любові да роднага краю, сімвалам традыцый, непарыўнасці паміж мінулым і сучаснасцю. Таму вельмі важна памятаць і імкнуцца захаваць традыцыі і ўмацаваць самасвядомасць народа:

*Я табе па-сяброўску зайздрошчу,*
*Во жыве ў тваім ціхім двары,*
*Як матыў паўзабыты, стары,*
*Лёгкіх крокаў* ***Купалавых*** *пошчак.*

Узаемасувязь мінулага і будучыні падаецца аўтарам пад "*радкамі ненапісаных вершаў*". Генадзь Бураўкін мае на ўвазе будучыню, якая захавае ў сабе ўсе набыткі мінуўшчыны, недапісаныя радкі – гэта працяг таго, што ўжо было закладзена раней. Аўтар выказвае надзею на светлую будучыню, надзею на тое, што больш ніколі не паўторацца жахлівыя моманты гісторыі. Імя Янкі Купалы сімвалізуе сабой сувязь паміж пакаленнямі.

*Калі адгрукочуць трамваі і самазвалы,*
*Пагаснуць у інтэрнатах запозненыя агні,*
*Па Мінску задумліва крочыць* ***Янка Купала,***
*Радкі ненапісаных вершаў шэпчучы ў цішыні.*

У сваіх вершах Генадзь Бураўкін таксама звяртаецца да пытання становішча беларускай мовы. Аўтар адзначае, што класікі беларускай літаратуры ўнеслі вялікі ўклад у яе захаванне і перадачу нашчадкам гэтага вялікага скарба. Нашчадкі павінны зразумець, якой нялёгкай справай было захаваць мову ў складаныя гістарычныя часы, і не толькі захаваць, але і навучыць цаніць яе. Зараз, калі лёс беларускай мовы ў руках нашчадкаў, у вершы гучыць спадзяванне на тое, што нашчадкі не проста будуць ёю захапляцца ёй, але і змогуць узняць яе:

*Слова наша роднае, хапала*
*На стагоддзі доўгія цябе.*
***Багдановіч, Колас і Купала***
*Прыпадалі да цябе ў журбе …*

Блізкімі яго сэрцу паэта з'яўляюцца творы Янкі Купалы, Максіма Багдановіча і іншых класікаў беларускай літаратуры, якія аказалі моцны ўплыў на яго светаўспрыманне:

*Так карцела – сляза закіпала,–*
*Каб да сэрца хаця б здалёк*
*Прыплывалі жалейка* ***Купалы,***
*Багдановічаў васілёк…*

Прарокі Айчыны Янка Купала і Якуб Колас здолелі абудзіць у беларусаў пачуццё годнасці і нацыянальнай самасвядомасці. Генадзь Бураўкін выказвае думку аб тым, што пакуль на беларускай зямлі будуць існаваць такія адданыя роднай зямлі людзі, у якіх могуць вучыцца і пераймаць вопыт наступныя пакаленні, немач і знявага ніколі не змогуць скарыць беларускі народ.

**Заключэнне.** Прэцэдэнтныя імёны паўстаюць і функцыянуюць у пэўнай лінгвакультурнай прасторы, а таму іх прырода цалкам абумоўлена культурай народа. Вывучэнне прэцэдэнтных імёнаў дае важныя звесткі пра моўную карціну свету беларусаў, культурныя канцэпты, якія адлюстроўваюцца ў мове. Прэцэдэнтныя імёны валодаюць пэўнай канатацыяй і ў беларускай мове яны маюць свае спецыфічныя адценні.

1. Нахимова, Е. А. Прецедентные имена в массовой коммуникации: монография / Е. А. Нахимова. – Екатеринбург: УрГПУ, 2007. – 207 с.



Репозиторий ВГУ